**Калі на ўсіх адна бяда**

***У многіх сем'ях захоўваюцца свае каштоўнасці, свае рэліквіі. Мне ў спадчыну засталіся ні залатыя бранзалеты, ні сядзібы і фамільныя скляпы, а ксеракопіі двух пісьмаў – сціплае ліставанне маёй бабулі Алены Клямёнак з вілейскай Слабады і выратаванага ёю чырвонаармейца Міхаіла Канавалава з падмаскоўнага Серпухава. Колькі чалавечай удзячнасці і сардэчных слоў занатавана на аркушах са школьнага сшытка! Удзячная памяць людзей пра нашых продкаў – самы каштоўны скарб, які застаецца нам і які пакінем мы сваім нашчадкам.***

Арыгіналы лістоў зберагае мая стрыечная сястра Алена Жукавец, якая жыве ў Маскве. Вельмі позна трапілі да яе гэтыя пісьмы, бо нікога са сведкаў тых падзей не засталося на той час у жывых. Нічога не далі і паездкі маёй кузіны ў Серпухаў, дзе жыў пасля вайны Міхаіл Канавалаў. Памёр ён недзе напрыканцы 70-х, а сваякі раз'ехаліся. У абагуленым банку дадзеных пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны "Мемарыял" я знайшла траіх Канавалавых Міхаілаў Андрэевічаў 1909 года нараджэння. Адзін з іх, як сведчуць дакументы, прапаў бяз вестак у лістападзе 1941. Менавіта ў лістападзе першага года той жудаснай вайны ў вясковую хату Клямёнкаў і прынеслі параненага абгарэлага чырвонаармейца Міхаіла Канавалава. Магчыма, гэта проста супадзенне. А магчыма, насамрэч быў гэта той самы баец.

Нічога не вядома пра тое, якім чынам апынуўся ён на захопленай фашыстамі тэрыторыі. Вілейка была акупавана нямецкімі войскамі ўжо 25 чэрвеня 1941 года. Ці не з вілейскага лагера ваеннапалонных збег нейкім чынам баец, бо ў бабуліным пісьме ёсць выказванне пра тое, што "ад нямецкіх палак схаваўся бядак у Слабадзе".

Як згадваў Міхаіл Андрэевіч у сваім пасляваенным лісце да маёй бабулі, быў ён на той час зусім слабы, згаладалы, моцна кантужаны, абгарэлы. Часта страчваў прытомнасць, амаль месяц ляжаць мог толькі на жываце, бо спаленая спіна крываточыла і жудасна смыліла. Гаспадыня лячыла яго, апрацоўвала раны, рабіла перавязкі, паіла зёлкамі і сырадоем.

***"Дорогая моя спасительница Елена Николаевна. Большое вам спасибо за вашу тёплую материнскую заботу! Нет слов, чтобы описать мою благодарность. Я ведь совсем не вставал с постели, был совсем глухой. Я не знал где я, и что со мной будет. Вы ухаживали за мной, перевязывали мои ожоги…"***

Чытаю гэта і ў памяці ажываюць моманты, калі бабуля Алена лячыла мяне малую, завіхалася каля вялікай рускай печы, дзе на прыпечку настойвалася гарбата з рамонкаў і валошак. Ды і ці толькі мяне яна лекавала? Помніцца, прыходзілі да мясцовай лекаркі і слабацкія кабеты, і з суседніх вёсак людзі. На гарышчы хаты ўсялякіх зёлак, карэньчыкаў, кары ды нейкіх дубчыкаў

было, як у экспазіцыі батанічнага музея. У судніку на кухні стаялі мазі ў баначках і настойкі ў бутэлечках. Бабуля сама іх рабіла з жывіцы, смальцу, алею. Казалі сваякі, што талент і веды ў бабулі ад яе дзеда Баслыка, слыннага на ўвесь Віленскі край шаптуна і народнага лекара.

Мяркую, таму і аказаўся паранены ў нашай хаце, што тут яму маглі рэальна дапамагчы. І дапамаглі. Не адмовілі ў прытулку, нягледзячы нават на тое, што фашысты маглі растраляць усю сям'ю. У сям'і гадаваліся чацьвёра дзяцей, а малодшаму, майму тату, было чатыры з паловай гады. У кіламетры ад Слабады пралягала шаша, па якой рухаліся варожыя войскі. Наваколле было працята страхам і пахам смерці. Ужо напачатку акупацыі, 12 ліпеня, фашысты прадэманстравалі свой звярыны нораў, расстраляўшы ля вёскі Стаўкі 130 вілейскіх яўрэяў і 13 беларусаў. Затым цягам двух месяцаў растрэлы паўтараліся. Было вынішчана фактычна ўсё яўрэйскае насельніцтва.

***«Дорогая Елена Николаевна. Я ведь был очень плох. Ничто мне было не мило на свете. А вы боялись, что из-за меня фашисты могут вас всех повесить. Но все равно помогли мне. Не помню, сколько был у вас, месяц или больше…»***

Толькі калі "пацыент" ачуняў, памацнеў, калі зацягнуліся раны і апёкі, старэйшы бабулін сын, мой дзядзька Міця, перавёз яго ноччу на лодцы на другі бераг Віліі, за якой пачыналіся глухія лясы, у якіх ужо дзейнічалі дыверсійныя партызанскія атрады. З гэтага часу ніхто і нічога не ведаў пра лёс выратаванага чырвонаармейца. Новыя беды, што як густы снег, валіліся на вёску і вяскоўцаў, вымушалі жыць адным днём, нічога не плануючы на непрадказальнае заўтра. Акупанты прымусова вывозілі вясковую моладзь на працу ў Германію, трапіў у чорныя спісы і старэйшы сын Кляменкаў Міця. Толькі больш як праз трыццаць гадоў здолелі сустрэцца з ім бацькі, браты і сястра. Другі сын, Фёдар Кляменак, васемнаццацігадовым быў мабілізаваны і накіраваны на перадавую, удзельнічаў у штурме Берліна, узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Бабуля верыла, што ў тым пекле яе Федзька выжыў таму, што ў свой час сям'я ўратавала чужога чалавека, рызыкуючы сваім жыццём.

Толькі, калі пачалі зацягвацца раны на душы і мірнае жыццё ўвайшло ў нармальнае рэчышча, паспрабавала бабуля Алена адшукаць уратаванага байца. Ці не праз Чырвоны крыж даведаліся, што жыве ён у Серпухаве, а потым праз Серпухоўскі РАУС і адрас дазналіся. І вось ужо ляціць ліст з вёскі Слабада ў Маскоўскую вобласць. Напісана пісьмо дзіцячай рукой і па-руску, мусіць, пад пад дыктоўку бабулі.

***"Уважаемый Михаил! Мы часто тебя вспоминали: где ты, как ты. Были очень рады, когда узнали, что ты живой и вернулся на родину, я рада за тебя, как за своего сына…***

***Мишенька, когда получишь это письмо, прошу, напиши ответ. А я тебе напишу о том, что мы пережили. Помнишь нашего старшего Митю, ты его называл братом Митюшей. Этого нашего Митюшу забрали немцы и вот уже 28 лет мы его не видим. Слава Богу, переписку имеем с ним.***

***Живём мы со стариком вдвоём, хорошо живём. Ты, Мишенька, напиши нам. Будем очень рады.»***

Міхаіл Канавалаў не прымусіў доўга чакаць. Адказаў пісьмом адразу, бо сам даўно хацеў адшукаць сваіх выратавальнікаў, вось толькі праз раненне не запомніў ні назвы вёскі, ні назвы ракі праз якую яго перавозілі на другі бераг. Запомніў толькі Міцюшу і Алену Мікалаеўну, якія яго даглядалі. Як доўга цягнулася гэта перапіска і ці былі яшчэ пісьмы акрамя тых двух, што старанна захоўвала бабуля Алена ў картонцы з самымі важнымі дакументамі, ніхто не ведае.

Неўзабаве вёску Слабаду знялі і на яе месцы разлілося Вілейскае вадасховішча. Бабуля з дзядулем дажывалі свой век у Маладзечне, дзе і пахаваныя. У Маладзечне пахаваныя і іх дзеці, акрамя старэйшага Міцюшы, чыя душа знайшла супакой пад небам канадскага Ванкувэра. А новыя пакаленні Кляёнкаў захоўваюць памяць пра чалавечнасць, дабрыню, моцны дух і мужнасць сваіх дзядоў і бабуль.

**Ала СТРАШЫНСКАЯ (КЛЯМЁНОК).**



**На здымку сямъя Кляёнкаў напрыканцы 40-х.**
**На пярэднім плане малодшы сын Міхаіл, які нарадзіўся ў 1943 г.**